Падтрымай "Вясну" на PATREON

За ўдзел у "Маршы раззлаваных беларусаў" суды завочна аштрафавалі двух гамельчукоў

14.12.2017 **Тэгі**: адміністратыўны пераслед, свабода мірных сходаў



Вадзім Васільеў і Яўген Маркавец. Фота БелаПАН

Як стала вядома "Гомельскай Вясне", 7 снежня ў Гомелі суддзі судоў Савецкага раёна Віталь Каўбеня і Чыгуначнага Андрэй Хлышчэнка правялі завочныя адміністрацыйныя працэсы, падчас якіх прыцягнулі да адказнасці ў выглядзе буйных штрафаў актывістаў Вадзіма Васільева і Яўгена Маркаўца за іх удзел 21 кастрычніка ў мітынгу пратэсту ў Мінску, які атрымаў назву «Марш раззлаваных беларусаў 2.0».

Як вынікае з адміністрацыйных пратаколаў, маладыя людзі *«прынялі ўдзел у несанкцыянаваным масавым мерапрыемстве 21 кастрычніка на плошчы Незалежнасці ў Мінску без дазволу Мінгарвыканкама, што выявілася ў прысутнасці групы грамадзян з выкарыстаннем сцяга бел-чырвона-*

белага колеру з мэтай публічнага выказвання грамадска-палітычных поглядаў» . Пратакол на **Вадзіма Васільева** склаў капітан міліцыі ЖАУС Гомеля **Юрый Варатніцкі**, на **Яўгена Маркаўца** - лейтэнант САУС **Максім Новік**.


На прыёме ў рэгіянальнага юрыста Праваабарончага цэнтру "Вясна" **Леаніда Судаленкі**, да якога актывісты звярнуліся па дапамогу, хлопцы адзначылі, што міліцыя апазнала і знайшла іх па фатаграфіі з акцыі, на якой яны трымаюць нацыянальны сцяг Беларусі.

> *"Міліцыя знайшла нас па фота з акцыі праз сацыяльную сетку Укантакце. У суды нас таксама выклікалі праз акаўнты сеткі Укантакце. Па гэтай прычыне мы вырашылі ў суды не хадзіць, а суды вынеслі завочныя пастановы пра штрафы*", - заявілі актывісты на прыёме ў юрыста.
>
> *"Працэсуальнае заканадаўства дапускае выклік у суд тэлефанаграмай або з выкарыстаннем іншых сродкаў сувязі. Вярхоўны суд СМС-позвы лічыць належным паведамленнем, а вось у дачыненні да акаўнтаў сацсетей яшчэ сваёй пазіцыі не пазначыў. У любым выпадку, суд павінен зафіксаваць не толькі сам факт адпраўлення электроннай позвы , але і факт яе дастаўкі, што ў сацыяльнай сеткі пацвердзіць досыць складана*", - адзначае Леанід Судаленка.


Юрыст ПЦ "Вясна" дадаў, што пастановы раённых судоў аб штрафах сёння абскарджаны ў Гомельскім абласным судзе.

Твитнуть









Бабруйчаніна будуць судзіць за "публічныя заклікі да арганізацыі мітынгу". Распавядаем, што гэта за артыкул


"Не менш за 100 000 чалавек укрыліся за мяжой". Выйшаў даклад УВКПЧ ААН пра сітуацыю ў Беларусі (дакумент)

Чатырох жыхароў Паставаў асудзілі да "хатняй хіміі" за фотаздымак з Маршу (дапоўнена)

Заява праваабаронцаў аб прызнанні 20 палітычных зняволеных

WWW.GAZETABY.CO

ПЕНІНТЭНЦЫЯРНАЯ СІСТЭМА



У СІЗА-1 існуе "прэс-хата"? Сабралі сведчанні былых вязняў


"Усё зроблена, каб паралізаваць тваю волю", — былая палітзняволеная Вольга Класкоўская

"Гэта ўсё адно велізарнае злачынства супраць чалавечнасці", — былы палітвязень шклоўскай калоніі

"Мораць голадам і холадам". Новыя сведчанні пра катаванні і акалічнасці смерці Вітольда Ашурка ў ПК-17



ГАЛОЎНАЕ







АПОШНІЯ НАВІНЫ

Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі. Сакавік 2023

"Бяляцкі, прасі літасці!" У Швецыі прадставяць спектакль-чытку паводле твораў Бяляцкага і Знака

Валерыя Цапкалу завочна асудзілі да 17 гадоў калоніі ўзмоцненага рэжыму (дапоўнена)

Запрашаем на прэзентацыю дакладу “Абмежаванне свабоды выказвання меркаванняў пад выглядам барацьбы з экстрэмізмам і тэрарызмам” у Вільні

Палітзняволенай Вікторыі Кульшы ў трэці раз дадалі тэрмін па крымінальнай справе

Мужчыну асудзілі на два гады калоніі па двух дыфамацыйных артыкулах

Паўтара года калоніі прысудзілі экс-кандыдату ў прэзідэнты Андрэю Дзмітрыеву

У СІЗА-1 існуе "прэс-хата"? Сабралі сведчанні былых вязняў

Дырэктару газеты "Белорусы и рынок" Канстанціну Залатых прысудзілі чатыры гады калоніі

МАНІТОРЫНГ ПАРУШЭННЯЎ

Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі. Сакавік 2023



ВЫБАРЧАЯ КАМПАНІЯ

Рэферэндум 2022



ВЫДАННІ

‹

›



Напрамкі дзейнасці

ПАРТНЁРСТВА

СЯБРОЎСТВА

E-mail: viasna@spring96.org | Пры выкарыстанні матэрыялаў сайта актыўная спасылка абавязковая | RSS

CC BY